Год I. Пятніца 23 сьнежня 1921 г. № 2.

Раніца

штодзенная, грамадзкая, палітычная і літэратурная газэта

АДРЭС РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ
Вільня, Вострабрамская № 1, „Hotel Szlachecki“ пак. № 2.
Рэдакцыя адчынена што дня, апрача сьвят, ад 11 да 1 і ад 5 да 7 гадз.

Цана нумару 20 марак.
Падпіска на 1 мес. . . 400 марак.
З перасылкай 1 „ . . 500 „
За граніцай ў два разы даражэй.

ЦАНА АБВЕСТАК:
За адзін радок звычайнага друку на 1 стр.—60 м.
ў тэксьце . . . . 75 м.
за тэкстам . . . . 40 м.
Для шукаючых працы на 10 прац. танейі.

Беларусы! Усе на выбары, як адзін! Усе на абарону Бацькаўшчыны!

Вільня 23 сьнежня.

Навокала і проціў выбараў у Віленскі Сойм ідзе патаёмная, але досыць моцная і энэргічная агітацыя.

Элемэнты варожыя да выбараў, ня брыдзяцца усялякімі спосабамі дыскрэтаваць выбары, пашырыць сярод жыхароў усялякія плёткі і інсынуацыі па адрэсу тых, хто хоча шчыра выканаць сваё выбарнае права, каб адкрыта, на ўвесь сьвет, абвесьціць волю і пажаданьня жыхароў Сярэдняй Літвы.

Праціўнікі выбараў кажуць, што яны ня йдуць на выбары дзеля таго, што, яны „не свабодныя“. Але гэта зусім няпраўда. Калі-б выбары былі „не свабодныя“ дык ня можна было-б друкаваць тое, што друкуюць аб выбарах, напрыклад „Белар. Вед.“

Гэтай часопісі вельмі хочацца, каб беларускі народ па загаду *Віл.* Белар. Нацыянальнага Камітэту стрымаўся ад учасьця ў выбарах. Але весткі з мейсц прыходзяць зусім іншыя. Напрыклад, беларусы ў Ашмянскім павеце ня толькі згадзіліся ўсе ісьці на выбары, але і адкрыта заяўляюць аб пажаданьні далучэньня да Польшчы.

Так сама і ў Браслаўскім і ў Лідзкім паветах беларусы — як нам пішуць — будуць галасаваць за сваіх прадстаўнікоў.

Цяпер ужо з пэўнасьцю можна сказаць, што ўсе высілкі маленькага гуртка віленскіх беларусаў— абвесьціўшых, што беларусы ні бы то ня пойдуць на выбары, — з'явіліся нічым іншым, як выбарнай качкай людзей, варожа настроеных да Польшчы.

Беларускі народ хоць і цёмны, але ўсё ж не такі ўжо цёмны, каб не зразумець, што сам адзін ён ня зможа дабіцца прызнаньня сваіх культурных, нацыянальных і дзяржаўных правоў; што ў яго ёсьць толькі адзін пэўны хаўрусьнік, з якім аб'яднаўшыся ён зможа ў будучыне спраўдзіць мары аб сваім нацыянальным і дзяржаўным істнаваньні.

Гэты хаўрусьнік — брацкая Вялікая Польшча.

Іншага хаўрусьніка ў беларусаў быць ня можа й тыя людзі, якія кіруюць у другі бок з'яўляюцца няпрыяцелямі нашага беларускага народу

Народ ніколі ня пойдзе за імі, бо добра ведае, што шлях, па якому яны йдуць, абмылковы і блудны.

Народ не падзякуе ім за варожую агітацыю проці выбараў у *В*іленскі Сойм, бо ведае, што толькі ў Сойме прадстаўнікі беларускага народу, верныя сыны Маткі Беларусі, скажуць сваё шчырае нацыянальнае слова, скажуць аб сваіх падзеях, сваіх крыўдах, сваім жалю...

✦✦✦✦

ТЭЛЕГРАМЫ.

ВАРШАВА 22 .XII. (А. В.) Рада міністраў пастанавіла, што надзвычайны камісар па справах рэпатрыяцыйных п. Грабскі мае правы ўнікаць у праступкі ўсялякіх урадаў і таксама выдаваць распараджэньні, якія павінны спаўняцца без замядленьня.

ВАРШАВА 22. XII (А. В.) „Пшэгл. Вячорны“ даносіць, што міністар скарбу п, Міхальскі ў хуткім часе прыступіць да асаблівай рэарганізацыі скарбовых уладаў, асабліва ў інстытуцыях першай і другой інстанцыі.

ВАРШАВА 22. XII. (А. В.) На апошнім паседжаньні Рады Міністраў разгледжана справа Горнага Шлёнзку і таксама ўмова польска-чэшская. У канцы Рада дайшла да польска-літоўскага спору. У гэтых справах рэзалюцыі ня прыняты і зьявяцца тэмай на паседжаньні чацьвярговым Рады Міністраў, якое адбудзецца ў Бэльвэдэру пад старшынством Начальніка Панства.

ВАРШАВА 22. XII (А.В.) Прафэс. Ашкеназі выехаў да Парыжу, дзе правядзе рад канфэрэнцыяў з прадстаўнікамі ўлад, пасьля чаго выедзе ў Жэневу.

ВАРШАВА 22. XII. (А. В.) Прыехаў у Варшаву з Масквы дарадчык польскага пасольства Кноль.

ВАРШАВА 22. XII. (А. В.) Учора паліцыя зрабіла шмат рэвізый у магазынах, шукаючы шоўку, карунак і іншай кантрабанды. Сканфіскаваны тавар будзе праданы грамадзянству.

ВАРШАВА 22. XII. (А. В.) На Варшаўскай гэльдзе трымаецца далейшы спадак заграгічных грошай, даляры па 2825, франкі 230. мар.

З Горнага Шлёнзку.

КАТАВІЦЫ 22. XII (А. В.) Начальнік аддзелу рэлігій пры народнай радзе кс. Левек паведамляе, што каталікоў, на прылучанай да Польшчы частцы Горн. Шлёнзку ёсьць 93 проц; пратэстантаў 6 проц. і жыдоў меней як 1 проц. Аднэй з паважнейшых спраў кс. Левек лічыць арганізаваньне ў Катавіцах біскупства і спадзяецца, што Кардынаў Бэртрам ня будзе з гэтым спрачацца. У справе пратэстантаў ён будзе старацца зрабіць так, каб пратэстанская Кірха мела сваю незалежную ад Бэрліна арганізацыю. Жыдоўская сынагога застаецца без адміністратыўных перамен.

БЫТАМ 22.XII (А. В.) У Бытаме, у аружэйнай краме Бахмана знайшлі вялікі склад аружжа.

З Саудэпіі.

Масква 22.XII (А. В.) Здарэньні ў працы рээвакуацыйнай камісіі паказываюць, што савецкі урад ня меў замярэньня ганарова спаўняць рыжскую умову.

Старшыня украінскай дэлегацыі ні колі ня бываў на агульных сходах, а яго заступнік не прызнае ніякіх абавязкаў, якія былі ужо прыняты, але да таго часу не выкананы. Напрыклад, ня гледзячы на тое, што была зроблена умова аб рээвакуацыі польскіх закладаў вывезеных з Польшчы—ні водны з іх яшчэ ня зьвернены.

БАРАНАВІЧЫ 22.XII (А. В.) Учора сюды прыбыў з Красноярску шалон палякаў 5-ае Сібірск. Дывізіі.

✦✦✦✦

Навакола выбараў.

(Б. П. А. В.) Інфармацыйны аддзел Генэр. Выбаров. Камісарыяту паведамляе:

Згодна з атрыманымі весткамі, многалічныя ворагі выбараў распаўсюджываюць пагалоску, што жыхары, якім мінула 60, нават 50 гадоў могуць не падаваць свой голас на выбарах, бо з ім усё роўна ні хто ня будзе лічыцца.

Каб перасеч гэту шкадлівую агітацыю, выбаровым ураднікам ставіцца ў абавязак вытлумачываць, што права голасу маюць усе, каму толькі мінула 20 гадоў.

У Браслаўскім павеце.

З Браслаўскага павету паведамляюць што ў валасьцёх, прылягаючых да Ковенскай Літвы вядзецца гарачая агітацыя супроці выбараў. Агітары не перабарчывы ў спосабах. Яны пускаюць у ход усялякія байкі.

Напрыклад, кажуць, што Польшча замяраецца вярнуць паншчыну, прымусіць жыхароў з вёсак насіць асобае, „хлопскае“ адзеньне і г. д.

Жыхаром, якія запісаліся ў сьпіскі галасуючых дакляруюць па 1.000 рублёў „остамі“ за галасаваньне за Літву.

У Дрысьвяцкай воласьці, дзе цяпер шмат каму выдаюць грошы на адбудову зьнішчаных праз вайну сяліб, агітуюць, каб усе, хто атрымаў грошы, галасавалі за Літву, бо адышоўшы да яе ня трэба будзе сплачываць пазычаных ад польскага ўраду грошай.

У Ашмяншчыне.

У цэлым павеце пануе настрой прыхільны да выбараў і да злучэньня з Польшчай. Літоўцы ня маюць папулярнасьці паміж вясковых жыхароў.

З боку ўсходняй мяжы павету працуе проці-выбаровая аціітацыя. Агітатары заклікаюць жыхароў да байкоту выбараў і да дзельных выступаў проці іх.

✦✦✦✦

Здраднікі.

Усе напрамкі палітычнай беларускай мысьлі, якія не згаджаюцца з палітыкай Аляксюка, называць яго здраднікам, зьменьнікам беларускай справе.

А чаму ён здраднік?

Здраднік ён дзеля таго, што дамагаецца для свайго беларускага народу з якога ён сам вышаў, відавочных рэальных карысьцяў. Ен ня прывык працаваць бязвынічна, бяз формаў, якія зьмяшчаюцца толькі ў пустых словах.

І Дзеля гэтага ён здраднік...

Да беларускага руху прымазаліся, асабліва ў апошнія часы шмат расейцаў быўшых царскіх чарнасоценцаў. Яны цяпер у пэўных беларускіх кругох узялі верх над кірункамі беларускай мысьлі і ею на наша няшчасьце кіруюць.

Гэтыя людзі напэўна прычыняюцца да адбудовы бацькаўшчыны — для іх даражэйшага ім іхняй Масквы, якая ў той ці іншай форме не сягодня, дык заўтра, але прыйдзе—туды скіраваны ўсе іх мэты, ўсё іхняе жыцьцё.

Той напрамак беларускай палітычнай мысьлі, які вызнае Аляксюк, не падабаецца таксама і тым, якія прывыклі да грубага беларускага карыярызму да беларускіх міністэрскіх партфэляў, да бяздзельнага карыстаньня за дармавыя грошы жыцьця.

Хай сягоньня нават прыдзе з неба Божая ўлада і яны, па прывычцы будуць заўсягды не здаволены.

Для іх карысьць свайго народу, не рэальныя формы іхняй працы, а чмучаньне і вечнае валаводжаньне ім патрэбна – свая асабістая карысьць.

Для гэтай карысьці яны сябе пасьвяцілі, да яе толькі імкнуць, аб ёй, аб сваіх выгадах—толькі думаюць і над гэтым днём і ночу ламаюць сваю галаву.

Сіла пратэстаў і праціўчынаў, асабліва ў сучасны момант вельмі моцная, прыгожая, яна прыцягвае не аднаго. А на гэтых людзях — сыбірытах жыцьця—апіраецца іхняя не безкарыстная моц.

Партфэлі, бязчыннасьць і асабістая карысьць ім патрэбна і... толькі...

Яны ніколі не апіраліся на народ, а на гарадзкія муты, экзальтаваныя натуры, якія карыстаючы з шырокай волі і дзяржаўнага выразумленьня толькі так умеюць, што муціць.

Мута ім гэта патрэбна, бо ў мутнай вадзе лёгка рыбку лавіць.

Але аб народзе, яго бедах, мучэньнях яны ніколі ня думалі і ня думаюць. Іх гэта не абходзіць, бо ад гэтага ніякай карысьці для іх няма.

Аляксюк—здраднік!..

Але Аляксюк днём і ночу працуе над тым, каб паказаць народу вынікі свае працы.



У гэтым выніку паказываюцца.

Нават тыя, якія крыху не давяралі Аляксюку, сягоньня на яго глядзяць зусім інакш і за сваю ня веру яго перапрашаюць.

Бо ён выбраў шлях адкрыты, рэальны і па гэтай дарозе ідзе і па гэтай дарозе хоча весьці ўперад свой народ.

І па гэтай дарозе ён, Аляксюк, ідзе.

Калі выліваюцца патокі бруда і рознага недарэчнага на галаву Аляксюка, то толькі дзеля таго, што яны бязмозглыя і злыя. Яны відзяць, што ім Аляксюку ў—ні чым не дараўняць і яны пеняцца ад злосьці, яны слабыя.

Усе хітрыкі іхнія разьбіліся аб глухую сьцяну і... яны упалі.

А асабістае пачуцьцё баліць і дзеля гэтага і толькі дзеля гэтага яны брэшуць.

Бо іншай работы яны ня ўмеюць рабіць...

Адкрываюцца школы, аказываюць помач свайму народу. А гэта ім не падаецца.

І яны чэрняць, клянуць.

Народзе, ня вер ім!

Інакш дык мы і наша Бацькаўшчына згіне!

Ня цёмным, а адкрытым шляхам нашага беларускага жыцьця, мы ня пойдзем дарогай фальшы бязупыннага выпаводжаньня, а дарогай праўды і народных патрэб мы ідзём — прадусім карысьць і карысьць рэальная нашаму народу.

Па гэтай дарове ідзе Аляксюк і за ім ідзем мы. А нас многа...

Ен селянін і наш абавязак падтрымаць яго.

Бо дарога шчырая і праўдзівая. Толькі за ім!

Бо іншыя да яго не дарасьлі...

М. Б,

✦✦✦✦

Дэлегацыя Зьезду Заходняй Беларусі у Варшаве.

Зьезд Заходняй Беларусі, які адбыўся ў Вільні 11—12 сьнежня г. г. выбраў з паміж сябе дэлегацыю да Начальніка Польскай Дзяржавы, Польскага Ураду і Сойму для дакладу пастановаў і пажаданьняў Зьезду датычных беларускага народнага жыцьця, а так сама цэлае чаргі пытаньняў: эканамічных, аграрных і др.

Зьезд, стаўшы на грунце польскай дзяржаўнасьці, а такжа аўтамічнай лучнасьці цэлай Беларусі з Рэчыпаспалітай ня меньш выразна зазначыў свой беларускі характар і ў цэлай чарзе сваіх рэзалюцыяў і дакладаў з мяйсцоў ствярдзіў бязчынствы ўлад якія выразіліся ў змаганьнях з беларускай асьветай і культуральным разьвіцьцём. Зьезд даручыў сваім дэлегатам выразна заявіць Ураду, што беларусы дамагаюцца розных для сябе правоў.

Дэлегацыя на чале са старшынёй Зьезду п, Аляксюком у складзе прадстаўніка ад Навагрудчыны Д-ра Паўлюкевіча, ад Вілейшчыны селяніна Сымона Абрамчыка, ад Вілешчыны селяніна Міхала Каспяровіча, ад уцекачоў—Паўла Калечыса была прынята ў Варшаве Начальнікам дзяржавы, панам Прэзыдэнтам і міністрамі унутраных і заграніёных спраў.

Пан Прэзыдэнт Міністраў жычліва прыняў заяву, зложаную яму ад імені Беларускага Зьезду ў Вільні і ў адказе сказаў дэлегацыі што згодна з сучасным напрамкам палітыкі Польскага Ураду ў адносінах да беларускай народнасьці, народу гэтаму на ўсім абшары Рэчыпаспалітай Польскай прыслугоўваюць поўныя правы, забязьпечаныя грамадзянам Дзяржавы канстытуцыяй. Паасобныя Міністэрствы будуць апірацца і ў інструкцыях разосланых сваім выканаўчым органам, на словах і ў духу канстытуцыі, як на найсправядлівейшым і ядыным мерніку адносін дзяржаўнай улады да народнай меньшасьці беларускай датычна школаў і грамадзянскіх арганізацыяў, культурна прасьветных, а таксама прэсы, маюць у межах іхніх лаяльных адносін да дзяржаўнасьці польскай поўную свабоду рэалізацыі,

Пры такім зьдзейсьненьні народных пастулятаў народ беларускі мае перад сабою адкрытыя дарогі да пажаданага разьвіцьця.

Гэткія завярэньні Ураду, якія ўжо рэалізуюцца ў справе шкальніцтва, зрабіў на дэлегацыю як найлепшае ўражаньне.

Прадстаўнікі сялянства заявілі пану Прэзыдэнту, што верацъ у шчырасьць пачынаў Ураду і з сваей стараны даложаць усіх высілкаў, каб умацаваць у сваім народзе пачуцьцё польскай дзяржаўнасьці, якую уважаюць за пэўную падставу да свайго народнага жыцьця.

У адказе на рэзалюцыю зьезду характэрызуючай няшчасьці і нядолю беларускіх уцекачоў, якім пагражае пры павароце катаваньне ў чрэзвычайках, пан Прэзыдэнт, вельмі шчыра і прыхільна аднёсся да долі гэтых няшчасных і абяцаў якнайхутчэйшую дапамогу і асыгнаваў дэлегацыі на першыя патрэбы уцекачом дзьвесьце тысяч марак.

✦✦✦✦

Інтэрвью з д-рам Паўлюкевічам.

Наш супрацоўнік па даручэньні рэдакцыі меў інтэрвью з вярнуўшымся з Варшавы сябрам дэлегацыі ад З'езду прадстаўнікоў Заходняй Беларусі д-рам Паўлюкевічам, які ахвотна паведаў гэтак:

Першым чынам дэлегацыя мела аўдыенцыю ў Старшыні Рады Міністраў, п. Панікоўскага, які адначасова з'яўляецца і Міністрам Асьветы. Старшыня Рады Міністраў запэўніў дэлегацыю, што ўсе пастуляты і пажаданьні Камітэту Краёвай Сувязі, праводзяцца ў жыцьцё, а пажаданьні з'езду будуць так сама па магчымасьці спаўняць у першую чаргу найбольш балючая з іх, справа асьвятовая ў напрамку найхутчэйшага адчыненьня беларускіх школ, сэмінарыі, беларускіх вучыцельскіх курсаў і т. д. Асабліва надта сэрдэчныя адносіны п. Панікоўскага выказаў да марнага лёсу беларускіх уцекачоў, якія знаходзяцца ў вельмі цяжкіх варунках жыцьця; запэўніўшы, што будзе зроблена усё магчымае, каб палепшыць іх долю, ён прасіў перадаць ім, як гасьцінец к сьвяту, 200.000 пол. марак. Дэлегатаў жа сам Панікоўскі запрасіў вечарам у Вялікі Тэатр на „пана Твардоўскага" ў уласную ложу, трэба адзначыць што пад час спэктаклю, публіка вельмі цікавілася, сымпатызавала дэлегатам, быўшым ў Міністэрскай ложы, асабліва старым вясковым дэлегатам п. Абрамчыкам, які быў ў звычайным вясковым кажусе.

На другі дзень дэлегацыя зложыла візыт Міністру Заграцічных Спраў пану Скірмунту і Міністру Унутраных спраў п. Даўнаровічу. Абодва міністры запэўнілі дэлегатаў, асабліва падкрэсьлівая гэтае прадстаўніком сялянства, што ўсе іх заявы аб прыкрых фактах самадурства, незразумела шкадлівай палітыкі, а падчас і зьдзеку над сялянствам і нядбаньне аб іх патрэбах мейсцовай адміністрацыі, яны бяруць пад увагу і прымуць рашучыя меры да таго, каб гэтым фактам больш ня было мейсца і прапанавалі аб усіх фактах зьдзеку, калі яны гдзе паўтарацца, праз Аддзелы Краёвай Сувязі даводзіць да ведама польскага ураду.

Трэба падкрэсьліць, што наагул усе міністры з вялікім інтарэсам і прыхільнасьцю аднесьліся да простых слоў на шых сялянскіх прадстаўнікоў, у якіх з аднаго боку гучала пераконаная нацыянальная сьвядомасьць, сьмелы і рашучы пратэст проціў зьдзеку адміністрацыі, а з другога боку ня меньш шчырая і моцная вера беларускага сялянства у тое, што ў іхнім бяздольным лёсе дапамога прыдзе да іх не з Масквы якой бы яна ні была, а толькі ад братняга польскага народу з якім народ беларускі спаяўся крывёй у супольнай барацьбе з маскоўска-бальшавіцкай навалай.

Нарэшце дэлегацыя была прынята Начальнікам Дзяржавы п. Пілсудскім, якога шчыра вітала як лепшага сына польскага народу, заўсёды змагаўшагася за тыя ідэалы, якія красуюцца так сама і на нашых штандарах: „за вольнасьць і лепшую долю нашага народу".

За ў весь час пабыту дэлегацыі ў Варшаве ўся мяйсцовая прэса вельмі цікавілася працай дэлегацыі, як у напрамку агульна беларускім так і асабліва нашым з'ездам ад 11—12 сьнежня у Вільні. Варшаўскія газэты, зьмесьціўшы рэзалюцыі з'езду, і адзначыўшы аўдыенцыі ў Міністраў і Начальніка Дзяржавы і жадаючы лепш высьвятліць, як псыхолёгічную сторану з'езду, так і тыя палітычныя ньюансы, якія мелі мейсца ў працягу з'езду, зьмесьцілі мае інтэрвью.

Дэлегацыя ад з'езду прадстаўнікоў Заходняе Беларусі скончыўшы працу выехала з Варшавы на мейсца, каб паведаць сялянству, іх паслаўшаму тое, што яны бачылі і чулі сваімі ўласнымі вачамі і вушамі. Нельга не падкрэсьліць, што выехалі яны з Варшавы з лёгкім сэрцам.

✦✦✦✦

Хроніка.

Беларуская вучыцельская Сэмінарыя ў Маледэчне.

Адзін з сяброў дэлегацыі зьезду ў Варшаву, які зьвярнуся адтуль 22 сьнежня с. г., паведамляе, што дзякуючы стараньням Цэнтральнага Камітэту Краёвай Сувязі, Польскі Урад выдаў распараджэньне аб адчыненьні Беларускай у р а д о в а й (rządowej) вучыцельскай Сэмінарыі у Маладэчне, Вялейскага павету.

Канфэрэнцыя д-р. Паўлюкевіча у Прэзыд. Рады Мін. у Міністра Грамадзк. Апекі.

Учора 22 сьнежня вярнуўся з Варшавы д-р. Паўлюкевіч, сябра дэлегацыя, які перад выездам меў канфэрэнцыю ў Прэзыдыуме Рады Міністраў і Міністрам Грамадзянскай апекі (Віл. Бел. Прэс.)

Помач Беларускім уцекачом.

Дзякуючы стараньням Цэнтральнага Камітэту Краёвай Сувязі. 1) У найбліжшым часе адкрываюцца ў мяйсцох скупленьня уцекачоў беларусаў сталоўкі і таксама будзе пры гэтых сталоўках выдавацца падмога адзеткам і абуткам. (Віл. Бэл. Прэс.).

Распачала працу кантралёвая камісія Гаспадарственых ураднікаў, з мэтай знайсьці працу для здэмабілізаваных.(Б. П. А. В.).

Як даведываемся з «Biura prezed. T. K. R.»—дні 24, 25 і 26 сьнежня будуць няпрысутнымі ў ва ўсіх Гаспадарственных бюрах і ўстановах. (Б. П. А. В.).

Да зьезду акадэмікаў.

Зьезд даручае сваім органам правясьці ў жыцьцё пастановы першага міжнарадовага кангрэсу ў Празе аб прапагандзе ў Балтыцкіх краёх ідэі міжнарадовай канфэдэрацыі моладзі, згодна з мандатам, атрыманым Польшчай на кангрэсе.

У выканаўчы камітэт выбраны: Хацінскі (старшыня) Глузінскі, Чэрвінскі, Рэмбелінскі і Бапкоў.

У адміністрацыйную Раду Міжнарадовай Канфэрэнцыі акадэмічнай выбраны: Балінскі (старшыня), Чэрвінскі, Глузінскі, Яніслаўскі і Крупскі.

Стэнаграма З'езду Заходняй Беларусі.

Вільня 11—12 сьнежня 1921 г. 1-шы дзень З'езду.

(Гляндзі 1 № „Раніцы").

Пачынаюцца прывітаньні З'езду ад розных партыяў і арганізацыяў.

Слова бярэ прадстаўнік сялянскай партыі „Зялёнага Дуба" гр. Дзяргач.

Д з я р г а ч: Браты! Ад імя Беларускай Сялянскай Партыі «Зялёнага Дуба» вітаю З'езд і жалаю, каб гэты З'езд не раскалоўся, а быў бы ядыным, крэпкім і арганізаваным. Беларусы павінны мець адзін шлях просты і роўны. Не разьбівайцеся на часткі, на партыі—бо ў яднаньні сіла.

С ь в я х о ў с к і прадстаўнік польскай народнай партыі: Ад вякоў жылі тутака беларусы і палякі ў добрай згодзе. Яны разам дзялілі долю і нядолю. Цяперака настала пара, калі Беларускі Народ паўстаў да працы над адбудовай свайго жыцьця. Народ польскі раней абудзіўся. Польскі народ на сваіх плячах вынес усю цягату маскоўскай няволі, і цяпер скінуў яе, але ён ня спыніць свае барацьбы датуль, покуль яшчэ падняволены Беларускі народ. Датуль ня будзе забязьпечана наша і ваша свабода, покуль сэрца Беларусі—Менск будзе пад Масквою. Польскі народ са ўсіх сіл будзе Вам дапамагаць: Мы павінны знайсьці той сумежны шмях які дасьць нам магчымасьць супольна працаваць каб умацаваць нашыя сілы.

С т а р ш ы н я: Прадстаўнік Польскай Людовай партыі! Цэннае слова было Вамі сказана аб тым, што беларускі народ павінен стаць вольным, што павінна быць вызвалена зямля наша і сэрца нашай зямлі—Менск. Перадайце жа Вашым сыном, што беларускія сяляне рука аб руку пойдуць за польскім народам і ніякія праціўнікі не патрапяць зьвярнуць яго з гэтага шляху. Мы верым у тое, што мы ободва дэмакратычныя народы —шчыра і моцна сьціскаем свае брацкія рукі.

Прадстаўнік Беларускага Палітычнага Камітэту, пан Адамовіч:

Ад імя Беларускага Палітычнага Камітэту шчыра вітаю З'езд-прадстаўнікоў роднай зямелькі. Хай Бог нам паможа паразумецца аб нашай адпаведнай справе. Паразумецца бяз спрэчак, бяз гвалту, каб усе людзі, увесь сьвет пазнаў, чаго жадае Беларускі народ, з кім ён ідзе і за што нясе цяжкія ахвяры.

Хай увесь сьвет бачыць, што праўдзівыя беларусы з'ехаўшыяся з нашых вёсак, мястэчак і гарадоў і арганізацыі, працуючыя па ўсей тэрыторыі нашай зямелькі, сусім не таго напрамку і ня тых пагляда́ў, якія штучна выяўляліся на пражскай нарадзе, адбыўшайся ў кастрычніку г. году.

Хай наша адпаведная праца будзе тым добрым грунтам, на якім у хуткім часе вырастуць пышныя краскі жыцьця свабоднага Беларускага народу!

Хай наша праца аб'яднае ўсіх шчырых і пэўных беларусаў, каб яны зьліліся ў адзін магутны кірунак мысьлі, у адзін моцны парыў—стварэньня рэальнай мажэбнасьці існаваньня беларускай дзяржаўнасьці на грунце аб'яднаньня з брацкай для нас Вялікай Польшчай.

Хай жыве і красуе наша родная дарагая матка—Беларусь!

Абвесткі.

Ня слухайце ворагаў беларускага народу-агітатараў проці выбараў.

Рэдактар і Выдавец Вацлаў Адамовіч. Друкарня „ДРУК", Субач, 2.